**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай
рабоце
_________________________ А.Л. Толсцік
27 ___________________ 2016 г.

Рэгістрацыйны № УД- 3078 / вуч.

# АСНОВЫ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-23 01 10 «Літаратурная работа (па напрамках)»**

Мінск
2016

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-23 01 10-2013 ад 30.08.2013, вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі № Е 23-269/вуч., № Е 23-270/вуч., зацверджаных 29.05.2015.

**Складальнік:**
*Багданава Г.Б.*, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Рэцэнзенты:**
Тычко Галіна Казіміраўна – прафесар кафедры медыялогіі і вэб-журналістыкі, доктар філалагічных навук, прафесар.
Шаранговіч Наталля Васільеўна – дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**

Кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 18 от 29.06.2016);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 7 ад 30.06.2016 г.).

ЗАГ. КАФЕДРЫ___________________________Саянкова-Мельніцкая Л.П.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Асновы літаратурна-мастацкай творчасці” прызначана для студэнтаў, якія навучаюцца на першай ступені вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 10 Літаратурная работа (па напрамках).

Курс тэорыі, метадалогіі і практыкі літаратурна-мастацкай творчасці – важны кампанент падрыхтоўкі будучых творчых спецыялістаў (літаратурных рэдактараў, рэдактараў-стылістаў, рэдактараў-кансультантаў) у галіне паэзіі, прозы і драматургіі. Будучы рэдактар павінен **мець** навык прафесійнай работы з мастацкім тэкстам, які складае неад’емную частку культурнага набытку як асобнага чалавека, так і грамадства наогул.

**Мэта** дадзенай вучэбнай дысцыпліны – навучыць студэнтаў абгрунтавана і комплексна ставіцца да твораў прыгожага пісьменства, прымяняць атрыманыя веды на практыцы, арыентавацца ў разнастайнасці відаў літаратурных твораў, мець уяўленні пра стылі і жанры, сур’ёзна і ўдумліва разважаць і выказвацца аб сучасным літаратурна-мастацкім працэсе, улічваючы традыцыі як айчыннай, так і сусветнай літаратуры, а таксама тэндэнцыі сучаснай метадалогіі стварэння літаратурных твораў.

Агульную **накіраванасць** вучэбнай дысцыпліны складае вызначэнне сістэмы, метадаў і прынцыпаў, якія б садзейнічалі як аналітычнаму, так і практычнаму падыходу пры стварэнні літаратурнага твора. Гэта прадугледжвае выяўленне і выпрацоўку тыпалогіі творчых стратэгій ў сістэме асноўных літаратурных жанраў, што дапаможа вылучыць і сістэматызаваць як агульныя, так і спецыфічныя рысы разнастайных канцэпцый у практыцы літаратурна-мастацкай тыорчасці. Даследаванне падыходаў да стварэння мастацкага тэксту дазваляе стварыць цэласную карціну пераемнасці традыцый паміж класічнай літаратурай і найноўшымі практыкамі стварэння літаратурнага твора, а на аснове гэтай карціны разгледзець мастацкі твор як складаную шматузроўневую з’яву, у якой кожнаму элементу адведзена важная роля ў стварэнні гарманічна ўпарадкаванага мастацкага адзінства.

Вучэбная дысцыпліна **прадугледжвае** спалучэнне тэарэтычных ведаў з самастойнай практычнай дзейнасцю студэнтаў (напрыклад, напісанне і рэдагаванне літаратурна-мастацкіх работ у розных жанрах).

У сувязі з тым, што літаратура і мастацтва займаюць важнае месца ў сацыякультурным жыцці чалавека, дысцыпліна «Асновы літаратурна-мастацкай творчасці» адыгрывае значную **ролю** ў падрыхтоўцы спецыялістаў гуманітарнай сферы наогул і асабліва ў падрыхтоўцы тых спецыялістаў, адной з важных задач прафесійнай дзейнасці якіх з’яўляецца непасрэднае стварэнне літаратурных твораў. Гэтая дысцыпліна з’яўляецца лагічна-заканамернай і неабходнай часткай у сістэме літаратурнай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 10 “Літаратурная работа (па напрамках)”, уваходзіць у цыкл спецыяльных дысцыплін дзяржаўнага кампаненту і займае важнае **месца** ў падрыхтоўцы

спецыялістаў дадзенага профілю. Вучэбны курс дысцыпліны «Асновы літаратурна-мастацкай творчасці» ўзаемадзейнічае **з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі** («Гісторыя мастацтваў», «Культуралогія», «Беларуская літаратура», «Руская літаратура», «Тэоря літаратуры»), якія спрыяюць разуменню мастацтва і літаратуры, а таксама садзейнічаюць паглыбленаму трактаванню мастацкага твора як складанаарганізаванай вобразнай і светапогляднай сістэмы.

Асноўнымі **задачамі** дысцыпліны з’яўляюцца:

- знаёмства са спецыфікай літаратурна-мастацкай творчасці;
- разгляд спосабаў нараджэння і ўспрымання мастацкіх вобразаў;
- зварот да індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей аўтараў і іх уплыву на творчы працэс;
- фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб аб’ектыўным і суб’ектыўным баках літаратурна-мастацкай творчасці;
- дэманстрацыя сродкаў актывізацыі творчай дзейнасці.

**Патрабаванні да засваення дысцыпліны.**

Па заканчэнні вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць**:

– асноўныя паняцці і тэрміны сучасных літаратурна-мастацкіх школ;
– прынцыпы пабудовы літаратурна-мастацкага твора;
– метады аналізу структуры мастацкага тэксту;
– тэндэнцыі і напрамкі літаратурна-мастацкай творчасці на сучасным этапе.

Студэнты павінны **ўмець**:

– ствараць літаратурны тэкст, выкарыстоўваючы прыёмы мастацкай творчасці;
– аналізаваць літаратурна-мастацкія творы з гледжання пабудовы, выкарыстання мастацка-выяўленчых сродкаў;
– вызначаць эстэтычную каштоўнасць літаратурна-мастацкіх тэкстаў.

Студэнты павінны **валодаць**:

– навыкамі стварэння літаратурнага тэксту і прыёмамі мастацкай творчасці;
– методыкай аналізу структуры і сістэмы мастацкіх сродкаў у мастацкім творы.

У выніку засваення лекцыйнага курса, удзелу ў практычных занятках, вывучэння неабходнай літаратуры і азнаямлення з творамі сучаснай літаратуры ў розных жанрах студэнт павінен арыентавацца ў крытэрыях і прынцыпах ацэнкі мастацкага твора азнаёміцца з творамі беларускіх і сусветных пісьменнікаў, крытыкаў і літаратуразнаўцаў. Веды, атрыманыя ў працэсе вывучэння курса, студэнты павінны выкарыстоўваць у сваёй будучай прафесійнай дзейнасці ў якасці журналістаў, крытыкаў, літаратараў, рэдактараў аддзелаў мастацкай літаратуры ў спецыялізаваных СМІ па літаратуры і мастацтву.

**Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцыяў спецыяліста.** Спецыяліст

павінен: АК-4. Умець працаваць самастойна.

**Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста.** Спецыяліст павінен: САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне).

**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцыяў спецыяліста.** Спецыяліст павінен: ПК-15. Валодаць навыкамі глыбокага асэнсавання літаратурна-мастацкіх тэкстаў, разумець іх структуру і аўтарскія задачы, умець ажыцяўляць літаратурную апрацоўку журналісцкіх матэрыялаў. ПК-16. Самастойна ствараць як літаратурна-мастацкія творы, так і літаратурную аснову для іншых відаў мастацтва (тэатр, кіно, сцэнарыі для літаратурных перадач у аўдыявізуальных СМІ). ПК-17. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці. ПК-32. Умець прымяняць метады журналісцкай творчасці, ведаць спецыфіку працы над разнажанравымі тэкстамі СМІ.

**Характарыстыка рэкамендаваных метадаў і тэхналогій навучання.**

У выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Асновы літаратурна-мастацкай творчасці» выкарыстоўваюцца наступныя метады: герменеўтычны, кампаратывісцкі, семіятычны, метад сістэмна-цэласнага аналізу. Вывучэнне дысцыпліны спецыялізацыі прадугледжвае чытанне лекцый па тэматыцы кожнага з раздзелаў і правядзенне заняткаў у выглядзе дыскусій, круглых сталоў. На практычных занятках шмат увагі будзе нададзена самастойнай рабоце слухачоў. Заняткі арганізаваныя па прынцыпу творчых майстэрняў, дзе студэнты дэманструюць навыкі напісання і рэдагавання літаратурных і літаратурна-крытычных твораў у розных жанрах. У ходзе вывучэння раздзелаў дадзенай дысцыпліны студэнтам прапанавана спалучаць лекцыйны матэрыял з самастойнай работай над вучэбнай і спецыяльнай літаратурай, а таксама азнаямленнем з творамі сучаснай літаратуры і напісаннем аўтарскіх работ.

**Колькасць акадэмічных гадзін**

| | |
|---|---|
| Факультэт | журналістыкі |
| Кафедра | літаратурна-мастацкай крытыкі |
| | |
| Курс | 1 |
| Семестр | 1 |
| Лекцыі | 18 |
| Практычныя | 10 |
| КСР | 8 |
| Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне | 36 |
| Усяго гадзін па дысцыпліне | 90 |
| | |
| Форма бягучай атэстацыі | Экзамен |
| Форма атрыманай | Дзённая |

вышэйшай адукацыі

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

## РАЗДЗЕЛ 1. УВОДЗІНЫ Ў ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКУЮ ТВОРЧАСЦЬ

### Тэма 1.1. Што такое прыгожае пісьменства

Вызначэнне літаратуры (эвалюцыя тэрміна). Месца літаратуры сярод іншых відаў мастацтва. Літаратурная мова і мова мастацкай літаратуры. Літаратура як сродак мастацкай камунікацыі. Універсальнасць мастацкага вобраза. Сінтэтычнае разуменне літаратуры. Слова – матэрыял для стварэння літаратурнага вобраза. Трыяда “Аўтар – Твор – Чытач”. Спосабы мастацкага абагульнення. Агульны падзел літаратуры.

### Тэма 1.2. Лірычны герой і лірычны пункт гледжання

Узнікненне, эвалюцыя і трактоўкі тэрміна “лірычны герой”. Вобраз лірычнага героя як спосаб раскрыцця аўтарскай свядомасці. Ці з’яўляецца лірычны герой “двайнікам” паэта? Лірычны герой як “я” створанае. Суадносіны паняццяў “жыццёвы прататып” і “мастацкі тып”. Лірычны пункт гледжання як эстэтычная і светапоглядная катэгорыя. Асаблівасці сучаснай лірыкі, жанравая разнастайнасць.

### Тэма 1.3. Чаму і навошта піша літаратар-пачатковец

Літаратурная творчасць як адзін са спосабаў камунікацыі са светам. Перадумовы ўзнікнення лірычнага твора. Спалучэнне інтэлектуальнага і духоўнага ў сучаснай паэзіі. Роля задумы ў працэсе ўзнікнення твора. Што абумоўлівае ўзнікненне творчай задумы? Натхненне – першапачатковы імпульс у стварэнні верша. Прырода паэтычнага натхнення. Пачатак творчага шляху літаратара: аб’ектыўныя і суб’ектыўныя перадумовы. Творчы патэнцыял і творчая рэалізацыя. Пасіянарнасць натуры пісьменніка. Стыхійнасць і заканамернасць пісьменніцкай творчасці. Прыгожае пісьменства як від духоўнай камунікацыі. Што такое графаманія?

### Тэма 1.4. Страх перад чыстым аркушам паперы

Як пачынаць пісаць літаратурны тыор? Чаму часам “не пішацца” пісьменніку? Трансфармацыя і ўзнаўленне рэчаіснасці ў выказванні літаратара. Унутраны свет пісьменніка як крыніца натхнення. Адлюстраванне ў творы рэальных аўтарскіх рысаў і ўласцівасцей асобы аўтара. Формы стварэння вобраза аўтара ў творы (вобраз “сябе” і вобраз уяўны). Вобраз аўтара і аўтарская пазіцыя.

### Тэма 1.5. Свабоднае развіццё пісьменніка і яго прафесійныя якасці

Спецыфіка творчых механізмаў фантазіі аўтара. Пісьменніцкая самаадукацыя. Узровень агульнай культуры аўтара. Творчая лабараторыя пісьменніка (што неабходна для творчасці?). Як пісьменніку знайсці свой “голас”? Творчая эвалюцыя літаратара (манера, стыль, светапогляд).

### Тэма 1.6. Мастацкі твор у сістэме літаратурнага факта

Структура літаратурнага факта ў найбольш абагульненай форме – двухэлементная сістэма: твор і пасіўнае меркаванне аб ім таго ці іншага

чытацкага асяроддзя. З'яўленне хаця б аднаго крытычнага выказвання аб творы пераўтварае літаратурны факт ў трохэлементную дынамічную сістэму: паміж творам і пасіўным аб ім меркаваннем паўстае меркаванне вербальна аформленае – увасобленае ў апублікаваным тэксце крытыка сведчанне асэнсаванага прачытання твора, прычым гэтае сведчанне амбівалентнае, бо яно накіравана як на сам твор, так і на чытацкае ўражанне аб ім. Структуру літаратурнага факта як сукупнасць міжтэкставых рэляцый, г. зн. узаемаадносін паміж: 1) асобнымі крытычнымі выказваннямі і творам, 2) крытычнымі выказваннямі ў межах комплексу рэплік (маецца на ўвазе іх дыялог), 3) крытычнымі выказваннямі і пасіўнымі чытацкімі меркаваннямі, 4) чытацкімі пасіўнымі выказваннямі і літаратурным творам.

**Тэма 1.7. Твор і яго крытычнае вытлумачэнне**

Інтэрпрэтацыйныя падыходы.Праблема ўспрымання ў сучаснай метадалогіі літаратурнай крытыкі.Спосабы аргументацыі ацэнак і вывадаў.Лагічнае і вобразнае ў працэсе аналізу твораў.Аб'ектыўнае і суб'ектыўнае ў крытыцы. Асноўныя інтэрпрэтацыйныя тэндэнцыі: імкненне дэшыфраваць тэкст, пошук у тэксце абагульненай ідэі, праблемы, глабальнага прынцыпу.

**Тэма 1.8. Аб'ектыўнае і суб'ектыўнае ў літаратуры**

Дыялектыка аб'ектыўнага і суб'ектыўнага пачаткаў у літаратурнай творчасці. Суб'ектыўна-аб'ектыўны, устойліва-зменлівы, інварыянтна-варыятыўны, "дакладна"-шматзначны характар прачытання і ацэнкі твора літаратурна-мастацкай крытыкай.Для пісьменніка літаратурны твор мае перш за ўсё суб'ектыўны сэнс: ён з'яўляецца рэалізацыяй пэўнага творчага праекта, задумы або – у больш шырокім сэнсе – артыкуляцыяй яго суб'ектыўнасці. Аднак, з пункту гледжання чытача, літаратурны твор мае аб'ектыўны сэнс, а, значыць, выступае ў якасці аб'екта, прызначанага для спасціжэння і вытлумачэння.

**РАЗДЗЕЛ 2. ПСІХАЛОГІЯ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ**

**Тэма 2.1. Адказнасць літаратара. Стаўленне да Слова**

Слова – матэрыял літаратуры. Літаратурны вымысел і домысел: суадносіны паняццяў. "Нам не дано предугадать, как слово наше отзовется". Праблема ісціны ў пісьменніцкай творчасці. Мастацкі тэкст – тонкая пластычная субстанцыя. Лагічнае і вобразнае ў працэсе стварэння мастацкага тэксту. Аб'ектыўная і суб'ектыўная ідэя твора. Чым адрозніваецца вершаваная мова ад мовы празаічнай?

**Тэма 2.2. Межы дасведчанасці літаратара**

Літаратурны твор – рэалізацыя творчага праекта аўтара. Твор з пункту гледжання аўтарскай задумы, псіхалогіі спасціжэння рэчаіснасці і з пункту гледжання непасрэднага чытацкага ўспрымання. Эстэтычны і інтэлектуальны кругагляд пісьменніка як асноватворны фактар літаратурнай творчасці. Спецыфіка творчай індывідуальнасці пісьменніка.

**Тэма 2.3. Некаторыя аспекты літаратурнай творчасці: парады вопытных літаратараў**

Матыў і мэты напісання твора. З чаго пачынаць пісаць артыкул, замалёўку, нарыс, апавяданне, аповесць? Віды і формы зачыну. Кампетэнтнасць пісьменніка і сапраўднасць падзей, адлюстраваных у творы. Ідэя, сюжэт, кампазіцыя і мова літаратурнага твора. Дэталь, дыялог, персанаж: спосабы стварэння.

**Тэма 2.4. Стыль і манера пісьменніка**

Стыль і манера: суадносіны паняццяў. Што ўплывае на выяўленне творчай манеры пісьменніка? Паняцце пра стылёвую плынь. Стыль як сістэма мастацкіх прыёмаў, уласцівая твору, творчасці пісьменніка, літаратурнаму напрамку, школе, аб’яднанню. Эвалюцыя стылю пісьменніка.

**Тэма 2.5. Аўтарская сталасць**

Пачатак – студэнне – сталасць: творчы шлях пісьменніка. Асаблівасці фарміравання творчай індывідуальнасці. Праграмныя (этапныя) творы ў біяграфіі пісьменніка. Паняцце пра творчы крызіс. Псіхалагічныя, аб’ектыўныя і суб’ектыўныя перадумовы творчага крызісу. Роля літаратурнай крытыкі на шляху сталення аўтара.

**Тэма 2.6. Свабода ў літаратурнай творчасці**

Літаратурная творчасць у перыяды палітычных рэгламентацый. Літаратура і цэнзура. Пытанні ўнутранай свабоды аўтара. Некаторыя аспекты з’яўлення “заказной” літаратуры. Ці павінен літаратар баяцца пісаць “у стол”? Што такое канцэптуалізацыя літаратурнай творчасці? Пісьменніцкая самакрытыка.

**Тэма 2.7. Творчы шлях літаратара**

Біяграфія пісьменніка – у яго творах. Праблема разумення творчай індывідуальнасці і ідэалізацыі “вялікага” чалавека. Антрапалагічны пункт гледжання крытыкі. Задачы крытыка-біёграфа. Эга-дакументы як крыніца рэканструкцыі пісьменніцкага вопыту.

**Тэма 2.8. Літаратурная канкурэнцыя. Стаўленне пісьменніка да крытыкі**

Беларускі пісьменнік у сучасным літаратурным працэсе. Паняцце пра традыцыю і наватарства. Літаратурныя пакаленні: ці магчыма паразуменне?
Літаратурная канкурэнцыя ў межах суполкі, згуртавання, руху. Літаратурная крытыка як слова “з нагоды” Слова. “Крытыкі – гэта вошы на чыстым целе літаратуры”? Крытык vs пісьменнік: артыкуляцыя суб’ектыўнасці. Крытычнае выказванне ў сістэме літаратурнага факта.

**Тэма 2.9. Правілы работы над мастацкім тэкстам**

Максімальная засяроджанасць аўтара над тэкстам. Што ўплывае на выбар тэмы? Як суадносяцца паміж сабой паняцці “тэма” і “ідэя”? Самарэдагаванне ў працэсе ўзнікнення літаратурнага твора. Адказнасць аўтара, заснаваная на ўсведамленні сур’ёзнасці пастаўленай задачы. Сюжэт і фабула. Выбар і распрацоўка сюжэтнай схемы. Класіфікацыя мастацкіх дэталей у творы. Сістэма персанажаў. Кампазіцыя мастацкага вобраза.

**Тэма 2.10. Крытэрыі і прынцыпы ацэнкі літаратурных твораў**

Перагляд традыцыйных прынцыпаў і крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі. Заканамернае звужэнне грамадскай функцыі крытыкі. Папулярызацыя ў крытыцы прынцыпу “мастацтва дзеля мастацтва”. Дыскрэдытацыя ў чытацкіх колах наіўнага ўяўлення пра надзвычайную грамадскую ролю крытыкі як камертона ў бягучым літаратурным працэсе. Узнікненне з’явы, якую можна акрэсліць як *“расплывістасць (амбівалентнасць) меркаванняў”*, што паўстала сёння не толькі перад крытыкамі, але і літаратуразнаўцамі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| **Нумар раздзела, тэмы** | **Назва раздзела, тэмы** | **Количество аудиторных часов** | | | | | **Колькасць гадзін ВСР** | **Форма контролю ведаў** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **Лекцыі** | **Практ. заняткі** | **Семінар. заняткі** | **Лабарат. заняткі** | **Іншае** | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | Што такое прыгожае пісьменства | 2 | | | | | | |
| 2. | Лірычны герой і лірычны пункт гледжання | 2 | | | | | | |
| 3. | Чаму і навошта піша літаратар-пачатковец | 2 | 2 | | | | | Вуснае апытанне дыскусія |
| 4. | Страх перад чыстым аркушам паперы | 2 | | | | | | |
| 5. | Свабоднае развіццё пісьменніка і яго прафесійныя якасці | 2 | | | | | | |
| 6. | Мастацкі твор у сістэме літаратурнага факта | 2 | | | | | | |
| 7. | Твор і яго крытычнае вытлумачэнне | | 2 | | | | | Работа ў групах, разгляд творчых прац |
| 8. | Аб’ектыўнае і суб’ектыўнае ў літаратуры | 2 | | | | | | |
| 9. | Адказнасць літаратара. Стаўленне да Слова | | 2 | | | | | Вуснае апытанне, |

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Количество аудиторных часов | | | | | Колькасць гадзін ВСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. заняткі | Семінар. заняткі | Лабарат. заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | | | | | | | | дыскусія |
| 10. | Межы дасведчанасці літаратара | | 2 | | | | | Абарона рэфератаў |
| 11. | Некаторыя аспекты літаратурнай творчасці: парады вопытных літаратараў | 2 | | | | | | |
| 12. | Стыль і манера пісьменніка | 2 | | | | | | |
| 13. | Свабода ў літаратурнай творчасці | | 2 | | | | | Разгляд творчых прац |
| 14. | Творчы шлях літаратара | | | | | | 2 | Абарона творчых прац |
| 15. | Літаратурная канкурэнцыя. Стаўленне пісьменніка да крытыкі | | | | | | 2 | Абарона творчых прац |
| 16. | Правілы работы над мастацкім тэкстам | | | | | | 2 | Абарона творчых прац |
| 17. | Крытэрыі і прынцыпы ацэнкі літаратурных твораў | | | | | | 2 | Абарона творчых прац |
| | **Всего** | 18 | 10 | | | | 8 | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

### Асноўная літаратура


1. Автор и текст: Сб. ст. / Под ред. В.М. Марковича, В. Шмида. — СПб.: Изд-во С-Петерб. ун-та., 1996. — 460 с.
2. Аймермахер К. Знак. Текст. Культура. — М.: Дом интеллектуальной книги, 1997. — 244 с.
3. Андреев Ю. Волшебное зрение (специфика литературы в современных преломлениях). — Л.: Советский писатель. Ленинградское отделение, 1990. — 432 с.
4. Аристотель. Поэтика. Риторика. — СПб.: Азбука, 2000. — 349 с.
5. Барт Р. Избранные работы. Семиотика. Поэтика. — М.: Прогресс. — 1994. — 615 с.
6. Барт Р. Литература сегодня // Барт Р. Избранные работы: Семиотика: Поэтика. — М.: Прогресс, 1989. — С. 233—245.
7. Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. — М.: Искусство, 1979. — 423 с.
8. Блум Хэролд. Страх влияния. Карта перечитывания. — Екатеринбург: Изд-во Уральского университета, 1998. — 352 с.
9. Веселовский А.Н. Историческая поэтика. — М.: Едиториал УРСС, 2004. — 646 с.
10. Гадамер Г.–Г. Актуальность прекрасного. — М.: Изд-во “Искусство”. — 1991. — 367 с.
11. де Ман, Поль. Аллегории чтения. Фигуральный язык Руссо, Ницше, Рильке и Пруста. — Екатеринбург: Изд-во Уральского университета, 1999. — 368 с.
12. Задорнова В.Я. Восприятие и интерпретация художественного текста. — М.: Высшая школа, 1994. — 152 с.
13. Кавалеўскі А. “Адчуць нявыказанае” (развагі аб інтэрпрэтацыі паэтычнага тэксту) // Слова ў кантэксце часу: да 80-годдзя д-ра філал. навук, праф. Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча: зб. навук. прац / пад агульн. рэд. д-ра філал. навук, праф. В.І. Іўчанкава. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. — С. 200–210.
14. Кавалеўскі А. Аз, Букі, Ведзі... Бум-Бам-Літ // Журналистика и искусство: Материалы научн. чтений, посвящ. творческой деятельности театр. критика, доктора филол. наук, профессора Т.Д. Орловой, Минск, 2005 г. / Белорусский государственный университет. — Минск, 2005. — С. 33—36.
15. Кавалеўскі А. Паэзія і крытыка: спосабы і формы ўзаемадзеяння // Сучасныя аспекты развіцця беларускай журналістыкі. Выпуск 4: Зб. артыкулаў; Рэдкал.: В.П. Вараб’ёў (адк. рэд.) і інш. — Мінск, 2001. — С. 75—80.
16. Кавалеўскі А. Эга-дакументы як крыніца рэканструкцыі пісьменніцкага вопыту // Журналістыка – 2008: Матэрыялы 10-й Міжнароднай навук.-практ. канф., Мінск, 11—12 снежня 2008 г. / Беларускі дзяржаўны універсітэт. — Мінск, 2008. — С. 467—470.

17. Кісліцына Г.М. Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры. — Мінск: Беларуская навука, 2000. — 118 с.
18. Ларин Б.А. Эстетика слова и язык писателя. — Л.: Художественная литература. Ленинградское отделение, 1974. — 288 с.
19. Литературный энциклопедический словарь / Под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. — М.: Советская энциклопедия, 1987. — 752 с.
20. Лотман Ю.М. О поэтах и поэзии: Анализ поэтического текста. Статьи. Исследования. Заметки. — СПб.: Искусство – СПБ, 2001. — 848 с.
21. Мандельштам О.Э. Слово и культура. — М.: Советский писатель, 1987. — 320 с.
22. Марков В. О свободе в поэзии. — СПб.: Изд-во Чернышева, 1994. — 367 с.
23. Мукаржовский Я. Исследования по эстетике и теории искусства. — М.: Искусство, 1994. — 608 с.
24. Озеров Л. Работа поэта. — М.: Советский писатель, 1963. — 336 с.
25. Сартр Ж.П. Что такое литература? Слова. — Минск: Попурри, 1999. — 448 с.
26. Сорокин Ю.А. Психолингвистические особенности изучения текста. — М.: Наука, 1985. — 168 с.
27. Тарановский К. О поэзии и поэтике. — М.: Языки русской культуры, 2000. — 432 с.
28. Трубецкой Н.С. Основы фонологии. — М.: Аспект пресс, 2000. — 351 с.
29. Тынянов Ю.Н. Литературный факт. — М.: Высшая школа, 1993. — 320 с.
30. Тынянов Ю.Н. Литературная эволюция. Избранные труды. — М.: Аграф, 2002. — 496 с.
31. Штайн К.А. Язык. Поэзия. Гармония. — Ставрополь: Ставропольское книжное изд-во, 1989. — 208 с.
32. Эйхенбаум Б.М. О литературе: Работы разных лет. — М.: Советский писатель, 1987. — 540 с.
33. Якобсон Р. Язык и бессознательное. — М.: Гнозис, 1996. — 247 с.
34. Jack, Ian. The poet and his audience. — Cambridge: Cambridge University Press, 1984. — 198 p.

**Дадатковая літаратура**

1. Батов В.И. По ту сторону слова. Очерки прикладной психогерменевтики: от Иисуса Христа до Владимира Высоцкого. — М.: МПА, 2001. — 268 с.
2. Барт Р. От произведения к тексту // Барт Р. Избранные работы: Семиотика: Поэтика. — М.: Прогресс, 1989. — С. 413—423.
3. Бахтин М.М. Эпос и роман. — СПб.: Изд-во “Азбука”. — 2000. — 304 с.
4. Белый А. Душа самосознающая. — М.: Канон+; ОИ “Реабилитация”, 2004. — 559 с.
5. Белый А. Проблема творчества: Статьи. Воспоминания. Публикации. — М.: Советский писатель, 1988. — 830 с.
6. Богданов В.В. Текст и текстовое общение. — СПб.: Санкт-Петербургский ун-т, 1993. — 70 с.

7. Вежбицкая А. Язык. Культура. Познание. — М.: Русские словари, 1997. — 416 с.
8. Виноградов В.В. Проблема авторства и теория стилей. — М.: Гослитиздат, 1961. — 614 с.
9. Выготский Л.С. Психология искусства. — М., 2001. — 211 с.
10. Гніламёдаў У. Класікі і сучаснікі: Артыкулы, нарысы, старонкі ўспамінаў. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. — 288 с.
11. Дильтей В. Описательная психология. — СПб.: Изд-во “Алетейя”. — 1996. — 155 с.
12. Задорнова В.Я. Восприятие и интерпретация художественного текста. — М.: Высшая школа, 1994. — 152 с.
13. Зарубежная эстетика и теория литературы XIX—XX вв: Трактаты, статьи, эссе. / Сост. К.Г.Косикова — М.: Изд-во МГУ. — 1987. — 510 с.
14. Кавалеўскі А. Крытык vs пісьменнік: артыкуляцыя суб’ектыўнасці? // Журналістыка – 2007: Матэрыялы 9-й Міжнароднай навук.-практ. канф., Мінск, 6—7 снежня 2007 г. / Беларускі дзяржаўны універсітэт. — Мінск, 2007. — С. 384—386.
15. Кавалеўскі А. Паэзія і крытыка: спосабы і формы ўзаемадзеяння // Сучасныя аспекты развіцця беларускай журналістыкі. Выпуск 4: Зб. артыкулаў; Рэдкал.: В.П. Вараб’ёў (адк. рэд.) і інш. — Мінск, 2001. — С. 75—80.
16. Кавалеўскі А. Сляды, меткі і памяць // Сляды, меткі і памяць: Зборнік эсэ / Уклад.: А. Кавалеўскі, С. Клюцкі, Н. Шакун. — Мінск: Права і эканоміка, 2008. — С. 3–8.
17. Кавалеўскі А.М. Чытацкі вопыт: асаблівасці ўспрымання і інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 4: Філал. Журн. Пед. — 2007. — № 1. — С. 122–128.
18. Кавалеўскі А. Чытаць – успрымаць – разумець // Тэксты — №12. — Мінск, 2009. — С. 75 – 101.
19. Лотман Ю.М. Избранные статьи: В 3 т. — Таллинн: Изд-во “Александра”, 1992. – Т.1 — 3.
20. Музыка и незвучащее / РАН. Научный совет по истории мировой культуры; МГУ им. М.В. Ломоносова. Ин-т мировой культуры; Редкол.: Е.В. Пермяков (отв. ред.) и др. —М.: Наука, 2000. — 327 с.
21. Стральцоў М. Пячатка майстра. Літ.-крытыч. артыкулы, эсэ. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1986. — 206 с.
22. Стральцоў М. У полі зроку. Зб. літ.-крыт. артыкулаў, эцюдаў, эсэ. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. — 144 с.
23. Храпченко М.Б. Познание литературы и искусства. Теория. — М.: Наука, 1987. — 576 с.
24. Шмелев Д.Н. Слово и образ. — М.: Наука, 1964. — 120 с.
25. Эйхенбаум Б.М. О прозе; О поэзии: Сб. ст. — Л.: Худож. лит. Ленингр. отд-ние, 1986. — 453 с.
26. Юнг К.-Г. Aion. Исслед. феноменологии самости. — М.: Изд-во “Рефл-бук” — Киев: Изд-во “Ваклер”. — 1997. — 330 с.

**Для дыягностыкі кампетэнцыі выкарыстоўваюцца наступныя формы:**

1. Вусная форма.
2. Пісьмовая форма.
3. Вусна-пісьмовая форма.

Да вуснай формы дыягностыкі кампетэнцыі адносіцца:

1. Вуснае апытанне.
2. Дыскусія.
3. Работа ў групах.

Да пісьмовай формы дыягностыкі адносяцца:

1. Індывідуальная праверка (кантрольныя апытанні).

Да вусна-пісьмовай формы дыягностыкі адносяцца:

1. Абарона рэфератаў.
2. Абарона творчых прац.

**Пералік заданняў для КСР.**

У якасці заданняў для КСР студэнтам прапаноўваецца творчая праца па тэмам:

1.Літаратурная канкурэнцыя. Стаўленне пісьменніка да крытыкі.
2.Творчы шлях літаратара (на выбар).
3.Правілы работы над мастацкім тэкстам.
4.Крытэрыі і прынцыпы ацэнкі літаратурных твораў.

# ПРАТОКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВО

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы паводле дысцыпліны, якая вывучаецца | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала праграму (дата, № прат.) |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Гісторыя мастацтваў | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |
| Культуралогія | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |
| Руская літаратура | Кафедра замежнай літаратуры і журналістыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |
| Тэорыя літаратуры | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |
| Беларуская літаратура | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА**

| № пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі (пратакол № __от ______________ 201_ г.)

Загадчыцай кафедры ______________ Л.П. Саянкова

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
кандыдат філалагічных навук, дацэнт ______________ С.В.Дубовік